Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

# ГАСЦІНЕЦ

Не бойся!

№ 11 (73), ЛІСТАПАД 2008 ГОДА

**Цытата**

**Адна з умоў свабоды – па чарзе быць кіруемым і кіраваць.**
**Арыстоцель**

# ЦЕНЫ – ГАЛОПОМ!

Белорусские цены уже догнали европейские. Только вот наша зарплата никак не спешит за европейской.

Рост цен на продукты питания впечетляет. На 20-50% выросли цены в магазинах Городка за последний год. Мы публиковали данные о ценах в ноябре 2007 года, а теперь сделали это сегодня. Таблица наглядно дает представление о росте цен. При этом этот рост цен почти в 2-4 раза выше официальной инфляции за отчетный период. А это значит, что рост цен оплачивает потребитель. Покупатель также из своего кошелька оплачивает не разумную политику государства в отношении предпринимателей, которые подняли цены, чтобы выжить в условиях диктата государства. И при общем молчании, рост цен будет продолжаться и далее. Национальный же бизнес в положении золушки для белорусских властей.

| | «Мальборо» автовокзал | | Сеть райпотребсоюза | |
|---|---|---|---|---|
| Наименование товара | Ноябрь 2007 | 22.11. 2008 | Ноябрь 2007 | 22.11. 2008 |
| Хлеб (чёрный) | 830 | 1210 | 870 | 1360 |
| Батон | 830 | 1320 | 860 | 1370 |
| Молоко 3,5%, 1 л | 1040 | 1400 | – | 1460 |
| Масло сливочное «Крестьянское», 200 гр | 1850 | 2430 | – | 2530 |
| Сахар, 1 кг | 1860 | 2100 | 1750 | 1970 |
| Масло подсолнечное, 1 л Злато | 5050 | 6430 | 5110 | 6460 |
| Колбаса вареная «Докторская», 1 кг | 8800 | 11700 | 8980 | 12800 |
| Макароны, 1 кг | 1940 | 2740 | 1940 | 2920 |
| Крупа рис, 1 кг | 1900 | 4070 | 1800 | 4030 |
| Крупа гречневая, 1 кг | 1960 | 2700 | 1900 | 2510 |
| Сельдь развесная, 1 кг | – | – | 5250 | – |
| Водка «Северная губерния», 0,5 л | 6110 | 6660 | 6110 | 6660 |

# Права арэнды за сімвалічны кошт

### атрымаў удзельнік №102 па выніках аукцыёна ў Гарадку

13 лістапада адбыўся аукцыён на арэнду "Пункта прыдарожнага сэрвісу" ў в. Кузьміно Гарадоцкага раёна, які размешчаны на міжнароднай аўтадарозе Е-95 на тэрмін 99 гадоў.

Раней арэнда дадзенага участка не была працягнута прадпрымальніку Васілю Ільніцкаму, які меў яго на працягу амаль 10 гадоў, а ў апошнія гады трапіў у няміласць уладаў.

Працэдура аукцыённага гандлю адбылася адпаведна вызначаных правіл. У ім прыняла удзел мінімальна дапушчальная колькасць удзельнікаў – два. Спачатку цану каля 532 тысяч рублёў прапанаваў удзельнік №101, потым новы кошт у 611431 руб. прапанаваў удзельнік №102. На гэтым і быў завершаны аукцыён.

Пытанні: "Чаму ў аукцыёне удзельнічалі толькі два прэтэндэнты? Адкуль ўзяліся на Гарадоччыне новыя арэндатары? Чаму такі сімвалічны кошт арэнды?" засталіся за межамі аукцыёна. У нашым закрытым грамадстве на гэтыя пытанні атрымаць адказы пакуль немагчыма.

Застаецца адкрытым таксама пытанне аб помніку архітэктуры – паштовай станцыі 19 стагоддзя размешчанай у Кузьміно, якая занесена ў нацыянальны рыестр ахоўваемых дзяржавай помнікаў, але ўжо з дзесятак гадоў знаходніцца ў аварыйным стане.

Калі новыя арэндатары створаць новыя працоўныя месцы у Кузьміно у вызначаны праектам тэрмін, адновяць паштовую станцыю, то тады магчыма лічыць дадзены аукцыён карысным для грамадства. Фактычныя ж затраты на пабудову прыдарожнага сэрвісу ў Кузьміно мусіць у тысячы разоў больш арэнднага кошту зямлі.

# Акцыя "Крок да еўрапейскасці"

**зладжана актывістамі Руху "За Свабоду" ў Гарадку**

На працягу двух дзён у Гарадку распаўсюджана некалькі соцен брашур "Што Еўрапейскі Саюз можа даць Беларусі". Агульнавядомая брашура апавядае пра магчымасці супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім Саюзам і Беларуссю. Чытачы маюць магчымасць даведацца аб тых перашкодах, якія існуюць на шляху паўнавартаснага супрацоўніцтва паміж народам Беларусі і еўрапейскай цывілізацыяй.

Адначасова з распаўсюдам брашуры актывісты Руху распаўсюдзілі на прамысловым рынку Гарадка, а таксама сярод часткі ўладальнікаў спадарожнікавых антэн спажывецкія пакеты з рэкламай першага незалежнага спадарожнікавага каналу "Белсат". Акцыя садзейнічала таму, што больш грамадзян Гарадка будзе ведаць аб існаванні незалежнага беларускага тэлебачання.

# ДАКТЫЛАСКАПІЯ – АБАВЯЗКОВАЯ ЦІ ДАБРААХВОТНАЯ СПРАВА?

### ГЭТАГА ВАМ НЕ ПАТЛУМАЧАЦЬ У РАЙВАЕНКАМАЦЕ, КАЛІ ВЫ НЕ ЗАПЫТАЕЦЕСЬ

Агульнанацыянальная кампанія па дактыласкапіі дарослага насельніцтва працягваецца ужо трэцці месяц. Дадзеная кампанія выклікана выбухам у сталіцы пад час святкавання Дня Незалежнасці 3 ліпеня. Нягледзячы на ўсе намаганні міліцыі ніякіх рэальных арганізатараў выбуху пакуль не знойдзена.

І зараз па ўсёй краіне міліцыя атрымаць адбіткі пальцаў і іншыя аналізы дапамагаюць ваенкаматы. Дакацілася гэта справа і да Гарадка. Амаль месяц выклікаюць павесткамі ў ваенкамат або арганізуюць выяздныя паседжанні супрацоўнікі ваенкамата. Калі кантынгент атрымліваецца пасіўны, то тады усім ваеннаабязаным, спасылаючыся на загад міністра абароны, робяць дактыласкапію, бяруць слюну і г.д. Але калі грамадзянін задае пытанне:"А гэта абавязкова?", то супрацоўнікам ваенкамата даводзіцца казаць, што дабраахвотная справа.

І гэта сапраўды так. Ніхто не можа абавязаць грамадзяніна рабіць дактыласкапію па-за межамі абавязковага спісу, але туды не трапляюць нашы запаснікі.

**Вынікі апытання на сайце твайго Гарадка:**
**"Ці адчуваеце Вы фінансавы крызіс?"**

| | |
|---|---|
| У мяне заўжды крызіс | 46,7% |
| Пачаў адчуваць | 40,0% |
| Не адчуваю | 6,7% |
| Маю іншыя клопаты | 6,7% |

# Супраць актывіста пачалі крымінальную справу

Аляксандра Жыдкевіча з Бычыхі Гарадоцкана раёну падазраюць у парушэнні арт. 433 Крымінальнага кодэксу "Атрыманне незаконнага ўзнагароджання".

Падставай для завядзення крымінальнай справы супраць актывіста, які працуе зубным тэхнікам, стаў запіс у "Кнізе заўваг і прапаноў" аб тым, што ён нібыта атрымаў грошы ў мясцовага маладзёна за лячэнне зуба. Напярэдадні з'яўлення запісу, Аляксандр Жыдкевіч звярнуўся да кіраўніцтва Бычыхінскага ФАПа са скаргай на тое, што санітарка, якая павінна яму дапамагаць, адмаўляецца сумленна выконваць свае абавязкі. Актывіст мяркуе, што гэтыя выпадкі звязаныя паміж сабой.

Мясцовыя міліцыянты з энтузіязмам узяліся раскручваць справу супраць актывіста Руху, які ўдзельнічаў у выбарчай кампаніі ў якасці назіральніка і раней актыўна дзяліўся інфармацыяй з журналістамі пра дрэнныя умовы пражывання маладых спецыялістаў.

Запісам у "Кнізе заўваг і прапаноў" зацікавіліся супрацоўнікі АБЭЗ Гарадоцкага РАУС, якія забралі дакументы маладога спецыяліста, апыталі шэраг вяскоўцаў і перадалі справу ў Гарадоцкую пракуратуру.

Следчы Гарадоцкай пракуратуры Сяргей Касіч распачаў следства па высвятленню ўсіх абставін гэтага запісу ў "Кнізе заўваг і прапаноў" і правёў першы допыт Аляксандра. Аляксандр Жыдкевіч стаў падазраваным па арт. 433 Крымінальнага кодэксу "Атрыманне незаконнага ўзнагароджання".

Маладому чалавеку даводзіцца трымаць чарговае жыццёвае выпрабаванне, якое звязана з яго грамадзянскай і працоўнай пазіцыяй.

– Мы заклікаем беларускую грамадскасць падтрымаць актывіста, які заявіў пра сваю грамадзянскую пазіцыю і трапіў пад пераслед уладаў. У Аляксандра няма блізкіх сваякоў. Ён страціў маці і не мае бацькі, якія маглі бы яго падтрымаць у цяжкую гадзіну, – кажа актывіст Руху з Гарадка Леанід Гаравы.

http://by.milinkevich.org/news/data/ic_77/4088/

# АБ'ЯВА

***Каб атрымліваць кожны нумар-Каб атрымліваць кожны нумар газеты "Гасцінец" паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.***

***Рэдакцыя абвяшчае конкурс чытачоў "І такое бывае!". Удзельнікаў конкурсу чакаюць прызы, а пераможцу - сюрпрыз! Матэрыялы дасылайце на адрас рэдакцыі. Апошні тэрмін – 31 снежня. Вынікі конкурсу будуць падведзены у першым навагоднім нумары.***

***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне правa і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты "Гасцінец".***

**Сайт твайго ГАРАДКА: http://haradok.belarda.org.** ***Чытайце больш навін на сайце роднага горада***

# БРАКОДЕЛ



Интересно: если бы министр здравоохранения заботился исключительно о паталогоанатомической службе, то как долго бы он продержался на своем посту?

Почему же наш министр образования, который решительно и настойчиво делает все возможное, чтобы максимальное количество выпускников школ командировать в ПТУ, до сих пор ходит с портфелем?

Вообще, кто у нас господин Радьков? Возглавив пропрезидентское общественное объединение «Белая Русь», он вдруг чрезвычайной озаботился поставкой неквалифицированной рабочей силы на стройки страны. В чем дело, господин Радьков? Вперед, лопату в руки, жену и дочерей под мышку - и на стройки родной Могилевской области, коль уж так сердце болит за Родину! Насколько я знаю, ваша родная деревня Вотня в Быховском районе переизбытка в кадрах не испытывает и охотно примет вашу помощь. А вот демонстрировать патриотизм за счет чужих детей... Вас, Радьков. не этому учили в школе. Да и страна не испытывает недостатка в «гениях педагогики», благодаря усилиям которых школьники никуда, кроме проф-техучилищ, не могут поступить. А вот коров доить в деревне Вотня некому.

За что должен получат зарплату министр образования? За то, что делает все возможное, чтобы в стране вырастало высокообразованнеепоколение, где значительная часть выпускников оканчивает вузы, может думать, творить, двигать вперед экономику и науку. Рабочую силу эти люди наберут из «третьего мира», но, имея высшее образование, они смогут управлять ими, задавать направление.

За что получает зарплату Александр Радьков? За то, что благодаря очередной школьной реформе, в следующем году выпускников станет почти в два раза больше, количество бюджетных мест в вузах не увеличится, зато значительно увеличится количество мест в ПТУ. Целый выпуск - одиннадцатый класс, который вынудили учиться в режиме год за два, часто без учебников и с путаницей в программах - Радьков, не задумываясь, списал в брак белорусской образовательной системы, заранее заготовив для этих детей места в ПТУ. Кто он после этого?

Высокопарные рассуждения на тему, что стране нужны рабочие руки, уже невозможно слушать. Особенно из уст тех, кто, задрав штаны, правдами и неправдами, сунулся в вузы. Тот же Радьков втиснулся в Могилевский пединститут, куда за недостатком мужчин в школах, принимали практически всех абитуриентов мужского пола, потом стал профессором, ректором, генератором реформы школы и перехода на 12-летнее образование. Не буду даже приводить хвалебные оды, которые звучали из его уст в адрес 12-летки (любой желающий легко найдет их в архивах газет). Не буду, просто потому что противно. Но переход на 12-летку, как выяснилось полгода назад, был браком нашей образовательной системы, оказывается, учить детей 12 лет в гимназиях и лицеях иностранным языкам, истрии мировой культуры, давать углубленные знания по отдельным предметам, Беларуси вовсе не надо, это, видите ли, делает систему образования слишком дорогой. Нам надо проще - научил читать-писать - и в ПТУ.

Радьков взялся исправить ошибки, он вновь демонстрирует уверенность и по традиции прикрывается высокими фразами. Он из разряда опасных - хватких и инициативных бракоделов с портфелями. Он как изварщенный врач, который заботится исключительно о том, чтобы у паталогоанатомов были объекты для исследования.

**Светлана КАЛИНКИНА, «Белорусский партизан».**

# Бензин в США подешевел

Цена на бензин в США продолжает стремительно снижаться. К началу этой недели средняя за неделю розничная цена топлива с октановым индексом 85-88 составила 1,892 долл./галлон (примерно 50 центов за литр).

Таких низких цен не было с начала марта 2005 года. При этом стоит отметить, что по сравнению с прошлым годом средняя цена упала уже на 1 доллар 20 центов за галлон, передает РБК.

Больше всего от снижения цен выиграли жители богатого нефтеперерабатывающими предприятиями побережья Мексиканского залива и в особенности Хьюстона, где литр бензина теперь можно приобрести за 44 цента. Чуть меньше повезло жителям Нью-Йорка и Лос-Анджелеса, где бензин стоит около 55 центов.

При этом стоит напомнить, что всего 4 месяца назад (7 июля) розничная цена бензина на АЗС достигла абсолютного рекорда – 4,114 долл./галлон (примерно 1,08 долл./литр). С тех пор цены на нефть упали почти в 3 раза, что и сказалось на стоимости бензина.

Не менее приятными для американских водителей выглядят и цены на дизельное топливо, которое также продолжает дешеветь. Его средняя за неделю цена по стране не опустилась до минимума за 20 месяцев - 2,664 долл./галлон (примерно 70,4 цента/литр).

В России, являющейся одним из мировых лидеров по добыче нефти, цены на автомобильное топливо тоже снижаются, однако происходит это отнюдь не так стремительно. Например, на этой неделе средняя цена бензина в нашей стране достигла 21 рубля 32 копеек, что всего на 1 рубль 50 копеек ниже средней цены, установившейся в конце сентября. Невзирая на мировое падение цен на «черное золото», за весь сентябрь топливо подешевело всего на 1,5%.

# ТРАГЕДИЯ НАРОДА

В который раз убеждаюсь, насколько эффективной бывает «промывка мозгов». Почти всю неделю основные российские СМИ ставили под сомнение стремление Украины считать Голодомор 1932 — 1933 годов геноцидом. Те цифры, которые называются в Киеве, в Кремле считают слишком завышенными. Признаюсь, что с такими настроениями шел на открытие соответствующей фотовыставки и я...

Фотовыставка, посвященная голодомору, была организована украинским посольством в Беларуси в костеле святых Семеона и Елены. Ее приурочили к 75-летию трагедии. Выставка состоит из 33 стендов, на которых размещены различные письменные свидетельства, фотодокументы, беспристрастно отражающие причины, историю, последствия и отношение украинцев к одной из самых страшных страниц своей истории. Слово «беспристрастно» здесь употреблено неслучайно. Я специально пытался найти какой-нибудь «наезд» на Россию, но так и не нашел. И не мог найти, ибо, как верно говорил Конфуций: трудно искать черную кошку в темной комнате. Особенно, если там ее нет. Это к тому, что взгляды на одно и тоже событие из Москвы и Киева были разными. Одни пытались увидеть в нем некую враждебную политику, другие призывали помолиться за души безвинно погибших от голода.

Что же касается национальной принадлежности жертв, то тот акцент, который увидели в Кремле на выставке, не делался вообще. Вместо этого не раз подчеркивалось, что вместе с украинцами от голода гибли русские, белорусы, евреи, поляки и т.д. Голодомор не является неким чисто украинским изобретением. Не пожалел он и Беларусь, и даже Сибирь. А главные виновники трагедии были не русские, а большевики.

Кстати, по поводу «излишней украинизации». Я процитирую письмо «отца всех народов» своему подельнику Кагановичу, из которого совершенно очевидно, куда был направлен главный удар: «Дела на Украине совсем плохи …. Плохо по линии ГПУ. Реденсу не по плечу руководить борьбой с контрреволюцией в такой большой и своеобразной республике, как Украина… Мы можем потерять Украину».

Написано оно было в августе 1932 года и не требует дополнительных комментариев. Геноцид украинского народа официально признали 14 государств мира.

Возможно, это совпадение, но вся прошлая неделя прошла под знаком не только Голодомора, но и новых цен на газ. Не хочется кого-то в чем-то обвинять, но цифра в 400$ за кубический кубометр природного газа прозвучала именно из Кремля. Очень похоже на то, что сделано это было неслучайно…

Естественно, Москва полностью проигнорировала все мероприятия по поводу Голодомора 1932 — 1933 гг. Д. Медведев не поехал в Киев. Кремль даже не выразил сожаления в отношении трагедии, что сделали очень многие страны. Не заметило трагедии и белорусское руководство. А ведь еще совсем недавно официальная пропаганда представляла визит Лукашенко в Киев как дело почти решенное.

**Александр Томкович.**

# ЭЎРАСАЮЗ, ТОЛЬКІ БЯЗ ЧЛЕНСТВА

Эўракамісія прапануе Беларусі пагадненьне аб асацыяцыі і супольным рынку. Для гэтага краіне трэ будзе пераняць усе заканадаўчыя акты ЭС і прызнаць вэрдыкты Эўрапейскага суду. Бюджэт Усходняга партнёрства складзе 2,1 млрд эўра.

Еўракамісія мае намер прапанаваць шасці постсавецкім краінам, у тым ліку Беларусі, заключыць пагадненне аб асацыяцыі і стварэнні новай еўрапейскай эканамічнай зоны, якая павінна стаць базай для развіцця агульнага ўнутранага рынку. Рашэнне адносна Беларусі будзе прымацца вясной у залежнасці ад дэмакратычнага прагрэсу краіны.

Сваім праектам Еўракамісія адказвае на ініцыятыву Польшчы і Швецыі аб пашырэнні супрацоўніцтва з Арменіяй, Азербайджанам, Беларуссю, Грузіяй, Малдовай, Украінай.

У праекце прапановы Еўракамісіі зазначаецца, што новыя пагадненні аб асацыяцыі будуць падобныя на дакументы, падпісаныя з Літвой і Польшчай перад пашырэннем ЕС у 2004 годзе, але не будуць утрымліваць планаў аб членстве ў Еўрасаюзе. Між іншым, пагадненне заклікана заявіць пра салідарнасць ЕС і прызнаць еўрапейскія памкненні краін Усходняй Еўропы.

Так, пагадненне прадугледжвае стварэнне адзінай зоны свабоднага гандлю для развіцця агульнага ўнутранага рынку, падобнай на Еўрапейскую эканамічную зону, якую сёння ЕС дзеліць з Ісландыяй, Ліхтэнштэйнам і Нарвегіяй.

Для гэтага шэсць постсавецкіх дзяржаў павінны будуць пераняць усе заканадаўчыя акты ЕС і прызнаць вердыкты Еўрапейскага суда.

Еўракамісія прапануе адкрыццёвізавых цэнтраў для атрымання шэнгенскіх віз, паступовае спрашчэнне візавага рэжыму і зніжэнне кошту віз, а ў доўгатэрміновай перспектыве — увядзенне бязвізавага рэжыму. Бюджэт Усходняга партнёрства складзе 2,1 млрд. еўра, без уліку страты 75 млн. еўра ад адмены віз.

Чакаецца, што 3 снежня прапанова Еўракамісіі будзе афіцыйна абнародавана, а 11 снежня — уключана ў палітыку ЕС на Еўрапейскім саміце кіраўнікоў краін аб'яднанай Еўропы. У чэрвені 2009 года прапануецца правесці саміт Усходняга партнёрства, а потым праводзіць рэгулярныя сустрэчы чыноўнікаў краін ЕС і Усходняй Еўропы. Канкрэтныя прапановы па напаўненні Усходняга партнёрства Еўракамісія прэзентуе вясной 2009 года.

# ЭМІГРАНТАЎ КАЛЯ ДВУХ МІЛЬЁНАЎ

Паводле прагнозаў Сусьветнага банку, перавод грошай у краіны, што развіваюцца, сёлета яшчэ вырасьце на 6,7 працэнта і складзе 283 мільярда даляраў. Але запавольваньне эканамічнага росту на Захадзе, а таксама ў Расеі, Казахстане, Украіне паменшыць перасылку грошай працоўнымі мігрантамі. Эксперты Сусьветнага банку чакаюць істотнага спаду па выніках 2009—10 гадоў.

У дзясятку краін, у якія найбольш пераводзяцца заробленыя суайчыньнікамі за мяжой грошы, уваходзяць Індыя, Кітай, Мэксыка, Філіпіны, Польшча, Румынія. У Кітай цягам гэтага году, як чакаецца будзе пераведзена 30 мільярдаў даляраў, у Польшчу –11 мільярдаў.

Дасланыя з-за мяжы грошы часам зьяўляюцца важнейшай крыніцай матэрыяльнага забесьпячэньня бедных краін. Напрыклад, перасылка грошай з-за мяжы складае 45 працэнтаў ад валавога ўнутранага прадукту (ВУП) Таджыкістана, 38 працэнтаў – Малдовы.

Беларусь на гэтым фоне выглядае больш сьціпла. У 2006 годзе ў краіну было пераслана 334 мільёны даляраў, што складае 0,9 працэнта ВУП. Такая ж сума пераводаў грошай была зафіксаваная і летась.

Экспэрты Сусьветнага банку ацэньваюць лік эмігрантаў зь Беларусі ў 1 мільён 800 тысяч чалавек, што складае 18,4 працэнта ад агульнай колькасьць насельніцтва. У дзясятку краін, у якія беларусы найчасьцей едуць на заробкі, уваходзяць Расея, Украіна, Польшча, Літва, Казахстан, ЗША, Ізраіль, Нямеччына, Латвія, Эстонія.

Паводле Сусьветнага банка, у сувязі з глябальным крызысам бяднейшыя краіны сьвету чакае зьніжэньне грашовых пераводаў з-за мяжы.

**Заснавальнік і рэдактар:**
Леанід Гаравы

**Адрас рэдакцыі:** 211573, г. Гарадок,
вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: haravy@tut.by
Тэл. 8-02139-4-42-52, маб. + 375296723842 (V),
+375298147766 (МТС)

**Наклад: 290 асобнікаў.**
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна